## ПРАЧЫТАЙЦЕ — ЦІКАВА!

# „Разам з масамі, пад кантролем мас"

Так называецца брашура, якую выпусціла Дзяржпалітвыдавецтва. Яе аўтар — старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў— расказвае аб перадавым вопыце савецкага будаўніцтва ў рэспубліцы, аб тым новым, што з'явілася ў рабоце Саветаў за апошнія гады.

Галоўным напрамкам развіцця сацыялістычнай дзяржаўнасці ў перыяд будаўніцтва камунізма, гаворыцца ў Праграме КПСС, будзе ўсебаковае развіццё і ўдасканаленне сацыялістычнай дэмакратыі, актыўны ўдзел усіх грамадзян у кіраванні дзяржавай, у кіраўніцтве гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, паляпшэнні работы дзяржаўнага апарату і ўзмацненні народнага кантролю над яго дзейнасцю.

Кніга складаецца з двух раздзелаў. У першым з іх падрабязна разглядаецца шырокае кола пытанняў, звязаных з дзейнасцю Вярхоўнага і мясцовых Саветаў рэспублікі.

Як вядома, за перыяд, што прайшоў пасля XX з'езда партыі, Цэнтральны Камітэт КПСС ажыццявіў рад важных мерапрыемстваў, накіраваных на разгортванне дэмакратыі, на расшырэнне правоў саюзных рэспублік у вырашэнні важнейшых гаспадарчых і палітычных задач. Жыццё поўнасцю пацвердзіла своечасовасць і правільнасць гэтых мерапрыемстваў. Яны садзейнічалі павышэнню палітычнай актыўнасці мас, далейшаму росту магутнасці Савецкай дзяржавы, развіццю эканомікі і культуры саюзных рэспублік, умацаванню дружбы народаў нашай краіны.

Вопыт, практыка работы Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, падкрэслівае аўтар, наглядна паказваюць, што дзякуючы расшырэнню правоў саюзных рэспублік пастаянна паляпшаецца яго дзейнасць. Вярхоўны Савет абмяркоўвае і вырашае шырокае кола жыццёва важных праблем.

Узмацненне гаспадарча-арганізатарскай і культурна-выхаваўчай работы вышэйшага органа ўлады рэспублікі прывяло да стварэння раду новых пастаянных камісій. Цяпер у саставе Вярхоўнага Савета БССР налічваецца дзевяць пастаянных камісій, у якіх працуюць 126 дэпутатаў і вялікая колькасць прадстаўнікоў дзяржаўных, навуковых і грамадскіх арганізацый. Гэта дазваляе Вярхоўнаму Савету лепш, паўней, чым раней, уздзейнічаць на развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. У кнізе прыводзіцца шмат прыкладаў, якія раскрываюць вопыт работы пастаянных камісій Вярхоўнага Савета. Яны сведчаць аб тым, што роля пастаянных камісій расце, што недалёка той час, калі яны будуць сістэматычна кантраляваць дзейнасць міністэрстваў, ведамстваў, саўнаргаса і актыўна садзейнічаць ажыццяўленню законаў і пастаноў Вярхоўнага Савета.

Шмат увагі ўдзяляецца вопыту работы мясцовых Саветаў. У сувязі з расшырэннем правоў рэспублікі, піша аўтар, створаны новыя ўмовы для дзейнасці гэтых самых масавых арганізацый працоўных. Яны надзелены дадатковымі правамі ў планаванні і фінансаванні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, да іх перайшоў рад функцый, якія раней належалі цэнтральным органам. Усё гэта сур'ёзна павысіла аўтарытэт Саветаў і разам з тым іх адказнасць за работу прамысловасці, за стан спраў у сельскай гаспадарцы і гандлі, за жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва, камунальную гаспадарку, пастаноўку народнай асветы і аховы здароўя, за найбольш поўнае задавальненне бытавых і культурных запатрабаванняў насельніцтва.

Карыстаючыся вялікім і цікавым фактычным матэрыялам, аўтар паказвае, як мясцовыя Саветы вырашаюць гэтыя сур'ёзныя задачы. У кнізе раскрываюцца найбольш характэрныя ў цяперашніх умовах формы арганізацыйна-масавай дзейнасці Саветаў: правядзенне сесій непасрэдна на прадпрыемствах і ў калгасах, апора на актыў, стварэнне няштатных аддзелаў выканкомаў, справаздачы кіруючых работнікаў дзяржаўных органаў перад насельніцтвам і г. д.

Нямала старонак прысвечана пастаянным камісіям мясцовых Саветаў, якія зарэкамендавалі сябе як актыўная сіла савецкіх органаў, як важны сродак далучэння шырокіх мас працоўных да кіравання дзяржавай.

«На шляху да грамадскага самакіравання» — так называецца другі раздзел кнігі. Ён прысвечан удасканаленню форм работы дзяржаўных органаў, узмацненню народнага кантролю над іх дзейнасцю, самаму шырокаму прыцягненню народных мас да кіравання дзяржавай.

**А. ВАЛЯНЦІНАЎ.**

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы***